Заметим, санкции будут действовать в течение одного года или до тех пор, пока движение "Талибан" не выполнит требования Совета Безопасности. В обратном случае Совет может принять решение о продлении санкций.

Кстати сказать, в последние годы РФ категорически возражала против каких-либо международных санкций, ибо, утверждали российские дипломаты, эти меры ударят прежде всего не по правящей верхушке, а по простому населению, ожесточая его. Между тем, как заявил официальный представитель ООН Фред Экхард, в районах Афганистана, где работают ооновские структуры, гуманитарная помощь "продолжается обычным порядком". Более того, санкции не распространяются на военную технику, предназначенную для гуманитарного использования, другие соответствующие поставки и рейсы с гуманитарным грузом.

Российский посол в ООН Сергей Лавров охарактеризовал санкции как "точечные". Он отметил, что они не должны ухудшить положение афганского населения. Тем не менее эксперты ООН полагают, что, к примеру, уже введенный год назад запрет на международные рейсы самолетов "Арианы" замедлил поставку в Афганистан некоторых гуманитарных грузов, привел к сокращению рабочих мест, ухудшил безопасность внутренних полетов из-за отсутствия запчастей.

Реакция талибов не заставила себя долго ждать. Министр иностранных дел в их администрации Вакиль Мутаваккиль заявил, что все это "равнозначно объявлению войны против ислама" и что "мы не выдадим бен Ладена"...

Теперь все телохранители Усамы бен Ладена — арабы.

А он ушел в горы...

Ну а где он, сей "камень преткновения"? Слухи о том, что "террорист номер один" Усама бен Ладен в срочном порядке меняет насиженное место и перемещается в горный массив Гиндукуш, недавно получили подтверждение из источников британской разведки. В соответствии с ними, Ладен покинул место своей дислокации на заброшенной военно-воздушной базе к югу от Кандагара и вместе с ближайшим окружением — тремя женами и телохранителями — на 16 мощных "джипах" направился в труднодоступные горные районы.

По данным британской разведки, незадолго до переселения бен Ладен заменил всю свою охрану, исключив из нее пакистанцев и афганцев, которые, мол, шпионили в пользу ЦРУ. Ныне телохранители террориста — только арабы.

Решение о перемене места дислокации бен Ладен принял после секретной встречи с одним из лидеров движения "Талибан" Мохаммадом Умаром, который сообщил, что США имеют конкретные планы уничтожить Усаму с помощью крылатых ракет, как это делалось пару лет назад. (Тогда бен Ладену удалось ускользнуть за несколько часов до атаки.)

Новое местонахождение террориста, видимо, очень хорошо скрыто и подготовлено для проживания в сложных условиях суровой горной зимы, когда снег засыпал все перевалы. Теперь, отмечает, в частности, газета "Хиндустан таймс", достать его американцам будет значительно сложнее, а с другой стороны, переезд бен Ладена ближе к территории оккупированного Пакистаном Кашмира, несомненно, вызовет озабоченность Индии. Да, наверное, и всех стран региона, ведущих борьбу против международного терроризма во всех его проявлениях.

НОВОСТИ

Как сообщает газета "Wall Street Journal", известный американский финансист Джордж Сорос высказался в поддержку плана Тэда Тэрнера купить 25-процентный пакет акций НТВ. Сорос сказал, что готов вложить и свои средства в предлагаемый план. По мнению Сороса, участие западных инвесторов необходимо для того, чтобы известный в России независимый телеканал не попал в руки газового гиганта, подконтрольного Кремлю. "Сейчас идет борьба двух идеологий. Итог будет иметь важнейшее значение для будущего России", — сказал он.

❑

Генеральный секретарь ООН Кофи Аннан призвал лидеров ведущих мировых держав простить долги беднейшим странам. Выступая на Всемирном экономическом форуме в Давосе, Аннан высказался за увеличение объёма помощи развивающимся странам, а также обратился к правительствам благополучных государств с просьбой открыть доступ на свой внутренний рынок товарам из стран "третьего мира".

❑

"Контингенты российских миротворцев в Косово и Боснии обследованы полностью, случаев заболевания лейкемией не выявлено", — сообщил в понедельник командующий воздушно-десантными войсками России генерал-полковник Георгий Шпак. Полностью обследованы также российские десантники, вернувшиеся на родину после прохождения службы на Балканах и продолжающие служить в частях и соединениях ВДВ. "Никаких жалоб и заявлений с их стороны не поступало", — подчеркнул командующий. Вместе с тем он отметил, что пока нет полных данных о тех российских военнослужащих, которые после возвращения из Боснии и Косово уволились из вооруженных сил.

❑

Помощник президента России Сергей Ястржембский назвал цифры предполагаемого сокращения войск в Чечне. По его словам, на постоянной основе в республике останется порядка 22 тысяч военнослужащих. Правоохранительные органы Чеченской Республики, по словам Ястржембского, составят еще 5 тысяч человек. Помощник президента отметил, что сокращение объединенной группировки начнется в феврале и прежде всего будут выводиться тяжелое вооружение и войска, не входящие в состав Северокавказского военного округа.

❑

29 января на 62 избирательных участках Таиланда прошли повторные выборы. Они были объявлены в связи с нарушениями, зафиксированными на этих участках во время всеобщих выборов 6 января. Результаты повторного голосования уже не способны повлиять на исход выборов: убедительную победу одержала партия "Тайцы любят тайцев", возглавляемая миллиардером Таксином Шинаватрой. Голосование может лишь скорректировать планы Шинаватры в отношении формирования партийной коалиции.

❑

После долгого перерыва, вызванного тяжелой болезнью, лауреат Нобелевской премии колумбийский писатель Габриэль Гарсиа Маркес опубликовал в Испании в газете "Паис" отрывки из книги воспоминаний. В опубликованных отрывках Маркес рассказывает о своем детстве и родителях. Как он заявил, эти фрагменты из первого тома его мемуаров. Всего он собирается написать три тома. В 1999 году Гарсиа Маркес заболел раком лимфы, был прооперирован и долго лечился в Мексике и США. Его длительное отсутствие привело к тому, что однажды по ошибке объявили о его кончине. В конце прошлого года писатель вновь появился на публике.

❑

Власти Эквадора проводят операцию по очистке берегов Галапагосских островов, на которые все-таки попала часть топлива из потерпевшего крушение судна "Jessica". Власти сообщают о том, что в результате экологической катастрофы уже пострадали 80 пеликанов, 50 морских львов, 6 морских черепах и две игуаны. 27 декабря пятно топлива достигло берега острова Изабела, места обитания 10000 гигантских морских черепах. Жители острова и спасатели уже собрали несколько сотен литров покрывшего берег топлива.

БЕЛАРУСЬ ТАЛЕНАВІТАЯ

Зваротны бок Месяца

Мікалай ТОЛСЦІК

Усё ж жанчыны і ў творчасці больш адкрытыя і шчырыя, чым мы, мужчыны. "Когда б вы знали, из какого сора растут стихи, не ведая стыда..." Гэта сумленна напісала пра сябе менавіта паэтка, з Боскай ласкі адораная талентам ператвараць будзённасць жыцця ў высокае мастацтва.

Тое адбывалася акурат у той час, калі многія мужчыны-паэты зацята псавалі людзям вочы, а сабе характар доказамі, быццам яны болей чым паэты. З-за таго ў рэшце рэшт і сапраўды збочвалі з паэтычнага шляху, хоць і працягвалі заўзята рыфмаваць да скону сваіх дзён. Вытокі жаночай творчасці, відаць, больш натуральныя. Асабіста я нешта не памятаю, каб хоць адна з парнаскіх насельніц хваравіта пнулася ў духоўныя месіі. У іх і тут усё адбываецца нібы само па сабе...

Нядаўна тры, безумоўна, вельмі таленавітыя жанчыны неяк вельмі даверліва і цнатліва дазволілі ўсім, каму гэта цікава, зазірнуць у свой унутраны свет, дзе спее змест, танальнасць, фарбы тых вобразаў, што ўвасабляцца потым у радках вершаў ці прозы. На мінулым тыдні ў галерэі сталічнага касцёла святых Сымона і Алены адкрылася выстава фатаграфій пісьменніцы Марыі Вайцяшонак, а таксама жывапісу паэтак Людмілы Рублеўскай і Людкі Сільновай.

Не ведаю, ці прыляцела б з Бруселя сусветна знакамітая Святлана Алексіевіч, ці з'явіўся б на вечарыне былы міністр і пасол Анатоль Бутэвіч, ці сабраліся б разам пераборлівы творчы бамонд і па маладосці не дужа пачцівае да аўтарытэтаў мінскае студэнцтва, калі б у Чырвоным касцёле проста вывесілі чарговую выставу так званага інсітнага, а працей кажучы, наіўнага мастацтва. Мусіць, не... У гэтай жа выставы зусім іншая прыцягальная сіла. Усе, хто прыйшоў, прыехаў і нават прыляцеў, патрапілі на выключнае відовішча кшталту сузірання зваротнага боку Месяца.

Толькі Месяц гэты — творчая асоба. У руху па мастацкім небасхіле яна звычайна паўстае ва ўсім бляску свайго майстэрства. Кожнае слова — не выпадковае, кожны твор — старанна адшліфаваны... Рынак вобразнага тавару патрабуе жорсткага прафесіяналізму.

На выставе ж у касцёле сціпла ўладарыла другая муза дзвюх паэтак і пісьменніцы. Яна не патрабуе ў час творчасці ўжывання густога сіта дасканалага прафесійнага майстэрства. Яна па прыродзе сваёй натуральная, як птушыны спеў: ёсць душэўная патрэба — ну і спяваецца. У нашым выпадку — малюецца або здымаецца, не надта клапоцячыся, спадабаецца гэта каму-небудзь ці не. Бо гэтае дзейства — духоўная рэч для сябе, акт глыбока інтымны, а не публічны. Але калі ён усё ж становіцца публічным, як на выставе ў Чырвоным касцёле, вось тут і пачынаецца цуд сузірання зваротнага боку Месяца. Вось тут выразна і відаць, у каго "из какого сора растут стихи" або проза.

Скажу адразу: смеццем у якасці будаўнічага матэрыялу для сваёй асноўнай творчасці тры таленавітыя жанчыны не карыстаюцца. Іх вобразы не растуць на глебе тла.

Марыя Вайцяшонак простай кодакаўскай "мыльніцай" нарабіла здымкаў вясковага дома. І не дома нават, а яго фрагментаў. Цыклы фатаграфій так і называюцца — "Вакно", "Белае крэсла", "Поўдзень". Так пільна смакаваць кожную драбніцу звычайнага жытла здатны толькі чалавек, для якога дом — найвялікшая каштоўнасць. І не столькі як нерухомая маёмасць, што мае рынкавы кошт, а найбольш як духоўны асяродак, які так балюча і разбуральна для лёсу страціць.

Вось так візуальна праявіўся самы выпакутаваны для пісьменніцы Марыі Вайцяшонак матыў. Дачка польскага асадніка, высланага з Пастаўшчыны за Урал, яна наблукалася ў дзяцінстве па халодных казённых дамах і дагэтуль не ведае нават дня свайго нараджэння. Відаць, таму яе проза — з гаючай мовай, з уменнем бачыць за звычайным вечнае — пра карані, якія трымаюць чалавека на зямлі і без якіх не можам мы людзьмі звацца.

У акварэльным цыкле Людкі Сільновай "Твары" адчуваюцца матывы фавістаў і Пікаса. І гэта таксама вельмі сугучна яе асноўнай творчасці. У вершах паэткі — густы інтэлектуальны замес. За імі вялікая кніжная культура, якая сілкуе творчасць. Такая крыніца натхнення, дарэчы, нічым не горшая за ўсе іншыя. Увогуле, літаратура ў нечым падобная на плаванне. У тым сэнсе, што можна шліфаваць брас і кроль у акіяне, а можна — у хларыраваным басейне. І яшчэ невядома, хто стане чэмпіёнам...

Паралелі з паэтычнай творчасцю выразна прасочваюцца і ў карцінах Людмілы Рублеўскай. Малюе яна грунтоўна, рэалістычна, аддаючы перавагу даўгачаснаму алею перад зыбкай летуценніцай акварэллю. Малюе тых, хто асабліва дарагі ёй і да драбніц зведаны — мужа, дзяцей... Але вось што адметна: у гэтых любоўна напісаных партрэтах няма памкнення да прыхарошвання "натуры".

Вершаваны радок Людмілы Рублеўскай такі ж. Гэтая паэтка з разраду тых, хто называе кошку — кошкай, а ваўка — ваўком. Ёй падуладныя і тонкі нюанс, і шматзначная алегорыя, і глыбінны падтэкст, і горкі сарказм...

Усе, хто прыйшоў у той вечар на выставу, пераканаліся ў гэтым яшчэ раз. Людміла Рублеўская і яе муж Віктар Шніп, паэт вельмі таленавіты, наладзілі там прэзентацыю новых зборнікаў сваіх вершаў. Дарма што ажыццяўляць выданне сямейнай пары давялося, відаць, за кошт небагатых уласных сродкаў і накладам усяго ў сотню асобнікаў. Паэзія — з'ява зусім не колькасная. І такія прызнаныя літаратурныя аўтарытэты, як Ніл Гілевіч, Вольга Іпатава, Анатоль Вярцінскі, іншыя сабраты па пяру, што бралі ўдзел у вечарыне, высока ацанілі творчы ўзровень новых прац Людмілы і Віктара.

Што ж тычыцца выдавецкага саматужніцтва і чытання вершаў у вузкім коле сяброў і аматараў, дык праз такія перыяды літаратура ўжо не раз праходзіла. То, дарэчы, былі зусім не горшыя часіны ў яе гісторыі.

Пэўна, надыходзіць чарговая...

ДОЛГ

Принял присягу — от нее ни шагу

Молодые воины Республики Беларусь присягнули на верность Родине

"Я, гражданин Республики Беларусь, находясь на службе в Вооруженных Силах Республики Беларусь, принимаю присягу и торжественно клянусь высоко нести честь и достоинство воина Вооруженных Сил Республики Беларусь, добросовестно овладевать военным делом, быть мужественным, верным и самоотверженным защитником своего народа, свято выполнять Конституцию, законы и воинские уставы.

Если же я нарушу эту мою торжественную клятву, то пусть меня постигнет суровое наказание закона и всеобщее презрение народа".

Эти слова в минувшее воскресенье произнесли около 12 тысяч молодых солдат в самых разных уголках Беларуси. Во всех воинских частях это был день принятия присяги.

Молодое пополнение частей Брестского гарнизона — более 700 парней в свежеподогнанном, еще не принявшем формы фигуры своих обладателей новом обмундировании, прошедших к этому времени курс молодого бойца — вместе с командирами прибыло в легендарную Брестскую крепость. Им выпала честь произнести слова клятвы в стенах крепости-героя, где почти 60 лет назад их сверстники грудью встретили врага, покрыв себя неувядаемой славой.

Пока солдаты стояли в колоннах, в крепость массово шел гражданский люд самых разных возрастов. Родные, близкие, друзья спешили присутствовать при важном для их солдата событии, поздравить, а заодно подкормить домашненьким. Мое внимание привлекла семья с двумя малышами, от которой старалась не отставать старенькая бабушка. Таким большим семейством родственники из Клецка приехали проведать и поздравить призванного из Ганцевичей внучка и племянника Сергея Сенкевича. Были здесь и родители Сергея — такая богатая на болельщиков у него получилась присяга.

А вот трое парней, приехавших из Несвижа — присутствовали при присяге двоюродного брата Александра Куликовича. Для уже отслужившего срочную Юрия Тронцы присяга не в новость, а его братьям Саше и Диме суровую школу жизни, каковой является армия, еще предстоит пройти.

А молодые воины уже выстроены в походные колонны, готовые двинуться непосредственно к месту принятия присяги. С разрешения руководства знакомлюсь с бойцами. Денис Тимохин призвался 15 января из Бреста. По гражданской профессии экономист, закончил в Минске Академию Управления при Президенте Беларуси. Ему посчастливилось служить дома. На вопрос, как привыкается в армии, отвечает: "Тяжело, но справляемся".

Рядовой Роман Романюк также брестчанин — таких у них, к слову, почти весь взвод. Ушли в прошлое времена, когда согласно неписаному правилу на срочную службу призывников отправляли в места, достаточно удаленные от дома. Беларусь сама по себе небольшая, да и в частях родного города служба теперь не возбраняется. В армию Роман пришел с пониманием того, что "мужчине надо сюда сходить". Про первые впечатления говорит: "Отлично, — и добавляет: — Главное, кормят хорошо".

Командир взвода старший лейтенант Василий Богачев сказал, что пришло пополнение как пополнение: "Как обычно, приходят ребята с гражданки, начинаем их учить: дисциплине, уставам, строевой подготовке — за две недели необходимый минимум они знают. Сейчас, по завершении курса молодого бойца, примут присягу и разойдутся по подразделениям нашей зенитно-ракетной бригады". Особенностью нынешнего призыва комвзвода назвал большое количество новобранцев, имеющих высшее образование. Для войск противовоздушной обороны с большим количеством техники, электроники это значит немало.

Перехожу к колонне артиллеристов. Рядовой Олег Родионов призван из Белоозерска. До армии два года работал на Березовской ГРЭС. От призыва не увиливал. Отношение к выполнению воинского долга сформулировал коротко: если пришел — надо служить. Защищать ему есть что и кого. На его присягу приехали близкие ему люди — родители, друг, сестра...

...И вот дислоцирующиеся в Бресте подразделения для принятия присяги построены. Специально прибывший на это событие министр обороны Республики Беларусь генерал-полковник Александр Чумаков принимает рапорт начальника Брестского гарнизона и направляется к микрофону:

"Служба в армии закаляет людей духовно и физически, учит преодолевать тяготы и невзгоды, дорожить честью, достоинством, дружбой и товариществом, наполняет каждого огромным зарядом моральной и психологической прочности, воспитывает чувство личной ответственности за судьбу своей Родины. Под руководством своих командиров и старших товарищей вы скоро освоите вверенное вам оружие, военную технику, станете настоящими воинами... От ваших знаний, стараний, молодых и крепких рук во многом будет зависеть военная безопасность нашего государства на ближайшие годы".

Министр обороны, по его словам, хорошо помнит свою личную присягу, которую принимал в 1958 году — и когда в войсках идет принятие присяги, он всегда выезжает в соединения и части.

На этот раз честь и ответственность принять присягу на глазах у главного военного чина страны выпала молодым бойцам Брестского гарнизона. Этот особый в жизни каждого солдата день они запомнят надолго. Благо тому способствовала великолепная, солнечная погода.

Сергей ВАСИЛЬЕВ.

УЛЫБНЕМСЯ С ХУДОЖНИКОМ

РЕМОНТ КОМПЬЮТЕРОВ

Рисунки Олега ПОПОВА.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 39

Аб выказванні згоды Рэспублікі Беларусь з далучэннем Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія, Рэспублікі Мальта, Усходняй Рэспублікі Уругвай, Турэцкай Рэспублікі і Рэспублікі Трынідад і Табага да Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей

У сувязі з далучэннем Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія, Рэспублікі Мальта, Усходняй Рэспублікі Уругвай, Турэцкай Рэспублікі і Рэспублікі Трынідад і Табага да Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 г. і ў адпаведнасці з палажэннямі часткі чацвёртай артыкула 38 названай Канвенцыі **пастанаўляю**:

1. Згадзіцца з далучэннем Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія, Рэспублікі Мальта, Усходняй Рэспублікі Уругвай, Турэцкай Рэспублікі і Рэспублікі Трынідад і Табага да Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 г.

2. Міністэрству замежных спраў накіраваць адпаведнае паведамленне дэпазітарыю Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 г.

3. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.

26 студзеня 2001 г. г. Мінск.

КАМЕНТАРЫЙ ДА УКАЗА

Рэспубліка Беларусь далучылася да Канвенцыі 1980 года аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей у 1997 г.

Яе ўдзельнікамі з'яўляюцца 70 дзяржаў.

Пры гэтым у адпаведнасці з артыкулам 38 Канвенцыі далучэнне да гэтага міжнароднага дагавора новай дзяржавы будзе мець сілу толькі ў адносінах з тымі дагаворнымі дзяржавамі, якія аб'явяць аб сваёй згодзе з такім далучэннем.

Паколькі Канвенцыя накіравана на забеспячэнне міжнароднай абароны дзяцей ад шкодных вынікаў іх неправамернага перамяшчэння, утрымання, выкрадання і продажу, на стварэнне механізма па іх хуткаму вяртанню ў дзяржаву іх пастаяннага месца жыхарства, наша краіна зацікаўлена ў пашырэнні колькасці ўдзельнікаў Канвенцыі.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выдаў Указ аб выказванні згоды Рэспублікі Беларусь з далучэннем да Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага выкрадання дзяцей Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія, Рэспублікі Мальта, Усходняй Рэспублікі Уругвай, Турэцкай Рэспублікі і Рэспублікі Трынідад і Табага.

Да гэтага часу Канвенцыя дзейнічала ў адносінах паміж Рэспублікай Беларусь і 14 дзяржавамі.

Баскетбол

ХОРОШАЯ МИНА ПРИ ПЛОХОЙ ИГРЕ

Виктор ХОРОШКО

Вот и закончился отборочный турнир XXXII чемпионата Европы по баскетболу. Выступление белорусской команды оставило двоякое чувство. Первую половину "отбора" провалили полностью. И это при том, что под знамена сборной были призваны лучшие из лучших гулливеров, выступающих как в первенстве Беларуси, так и за рубежом. Тогда в Белорусской федерации баскетбола посчитали, что во всем виноваты тренеры. На капитанский мостик срочно кооптировали Александра Александровича Борисова. И команда в какой-то степени преобразилась. При тех же, заметим, исполнителях.

В первой половине турнира особенно обидным было поражение от никогда и нигде не светившейся сборной Австрии, которое перечеркнуло все радужные надежды. А ведь перед стартом тогдашние тренеры во всеуслышание говорили о завоевании одной из двух путевок на финальную часть, которая пройдет в Турции. Группа-то у нас вполне проходимая. Особняком стоит разве что греческая команда. Она на голову сильнее всех остальных, что и доказала в очных встречах.

Белорусов поставили на место в первом же поединке. Ушатом холодной воды оказался разгром в Чехии. Тогда показалось, что поражение — всего лишь нелепая случайность. Увы, зря показалось. Конечно, в нашей команде собрались довольно сильные, индивидуально, баскетболисты. Куль, Мещеряков, Крюков, Бойдаков были чемпионами Европы в молодежном розыгрыше. Первые двое прошли школу американского студенческого баскетбола. Что еще надо?..

Ан нет. Сбор хороших игроков не означает, что перед очи болельщиков предстанет и хорошая сборная. Тем паче что и тренеры делали ошибку за ошибкой.

Чашу терпения переполнило выездное поражение от австрийцев — 66:68. А ехали ведь за победой. Ни у игроков, ни у тренеров не было и тени сомнения в благополучном исходе того поединка. Но австрийцы показали довольно быстрый, цепкий баскетбол, с хорошей взаимостраховкой и взаимозаменяемостью, что выбило у наших почву из-под ног. Они никак не могли вразуметь, что эти парни всем проигрывали по 20—30 очков. Не вразумели вплоть до финального свистка.

А дело всего лишь в том, что остальные соперники по группе отнеслись к австрийцам со всей серьезностью. Наши — с шапкозакидательским настроением.

Александру Александровичу пришлось бороться именно с этим недугом. Он не стал кроить состав — выбирать особо не из кого, а работал "с тем же материалом".

Больших обещаний Борисов не давал. Понимал, что победы сами по себе не приходят. Но высказывал уверенность, что игра сборной изменится.

И она изменилась.

На прекрасном эмоциональном подъеме отомстили за разгром чехам. Там было минус девятнадцать, здесь — плюс восемнадцать.

— Эх, в тот момент следующим соперником нам бы не греков, — вздыхает Борисов. — Им мы, конечно, уступаем. И по составу, и по сыгранности. Хотя сказать, что поражение от лидера удручающе подействовало на игроков, нельзя. Но эмоционально-психологическое настроение от этого не улучшилось.

Две недавние выездные игры против Польши и Эстонии показали, что Сан Саныч с командой на верном пути. Соперники и тамошние специалисты недоумевали: почему такая сборная влачит жалкое существование? И поляки, и эстонцы от белорусов еле унесли ноги. Нашим для побед в тех встречах не хватало самой малости. Трех-четырех объективных судейских свистков, например.

Можно представить, каково было бы настроение у команды, если бы те два проигрыша что-то для нас значили в турнирном отношении.

И вот поединок с Австрией.

— Дело чести — отдать соперникам долг, — звучало на всех углах из уст спортсменов, тренеров, болельщиков.

А когда стало известно, что в Минск не приедет трио лучших австрийских игроков (Асцерич, Ренфор, Стахич), у Борисова по-настоящему заболела голова. Попробуй убедить подопечных выкладываться в каждом эпизоде. Домашнее же фиаско подобно самоубийству.

Сколько нервов забрал этот матч у главного тренера!.. Бежали минуты, а на табло все светились неутешительные для нас цифры — 0:3, 7:12, 12:19. Так закончилась первая десятиминутка. Австрийцы переиграли белорусов на периметре и невзирая на то, что уступали в ростовых параметрах, под щитами. Плюс ко всему у них идут броски, а у нас сплошь холостые "выстрелы".

Борисов пытается варьировать состав. Но не идет игра ни у Шарко, ни у Мещерякова, ни у Пынтикова. В защите вскорости наладили страховку, а в нападении...

Только к середине второй четверти встречи получилось несколько эффектных атак, и сразу стало 27:23. К концу первой половины — 35:30. Небольшенький задел есть. Но от самой игры никаких эмоций. Команда никакая — медленная, неуверенная в себе. Где это видано, чтобы подряд пять атак завершились безрезультатно.

Во второй половине игры пошло дело у Руслана Бойдакова. Но и он после двух-трех эффектных действий допускал школярские ошибки.

Белорусы вздохнули легко только после того, как за 5 фолов покинули площадку лидеры австрийцев Майер и Вольчич (самый результативный у соперников).

А концовка и вовсе стала бенефисом Александра Куля, дважды вколотившего мяч в кольцо сверху.

Если судить по итоговому результату (71:54), реванш состоялся. Довольно убедительный реванш. Но, право же, такой безобразной игры сборной еще не приходилось видеть. Куда приятнее команда смотрелась во всех проигранных встречах.

Кстати, лучшими игроками в этот день были у белорусов Александр Куль, у австрийцев — Бернд Вольчич.

— Сегодня мы победили на характере, — сказал после матча Александр Борисов. — Я очень боялся, что в этом матче все подгонялось бы к итоговому положительному результату.

— Довольны ли вы своей работой в сборной? — спросили у Александра Александровича.

— Скорее да, чем нет. Все-таки добыли в пяти матчах две победы, — не стал лукавить главный тренер. — Еще в двух были близки к успеху.

— Чем обусловлена слабая игра команды сегодня?

— Только усталостью игроков. В домашних, после игры в Эстонии, тренировок я даже не давал ребятам силовых упражнений.

— Ваша оценка игроков, выступающих в чемпионате Беларуси?

— Большего от них требовать нельзя. Тем же Пынтикову, Шарко, Клемезю надо как можно больше соревноваться на европейском уровне, тогда у них будет рост в мастерстве. А что они почерпнут в родном первенстве, в котором на голову сильнее всех?

— Самая большая проблема сборной?

— Нет хорошего первого номера (разыгрывающего). У нас есть Кузьмин, но его не отпустили из команды, главным тренером в которой, что обиднее всего, работает наш земляк Иван Едешко.

— Каковы перспективы возглавляемой вами сборной?

— Нам нужна сыгранность. Это во-первых. С этой целью проведем несколько долгосрочных сборов. Нас уже стали приглашать на спарринги серьезные соперники. Это хороший знак. Надеюсь, что удастся привлечь в сборную Валерия Дайнеко. Он, несомненно, усилит команду. Да и у ребят пользуется непререкаемым авторитетом. Не сбрасываем со счетов "словенца" Лешкевича, "украинца" Юшкина. Заканчивают учебу в Америке Кучинский и Хаменя. Как видите, есть с кем работать. И, надеюсь, к следующему отборочному циклу, который начнется уже в июне, мы подойдем во всеоружии и заставим с нами считаться всех без исключения соперников...

...Сборная Беларуси в итоге заняла предпоследнее место. Какое-никакое преимущество в преддверии жеребьевки.

А в финал чемпионата Европы из нашей группы вышли сборные Греции и Эстонии.

Іване Шамякіну — восемдзесят!

НАРОДНЫ — значыць, любімы народам

Сёння, без перабольшання, уся Беларусь адзначае 80-гадовы юбілей аднаго з самых пашанотных сваіх сыноў — Івана Пятровіча Шамякіна. Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і дзвюх Дзяржаўных прэмій БССР — далёка не ўвесь пералік афіцыйных рэгалій любімага народам творцы. Але хіба справа ў рэгаліях? Ён заўсёды, ад самага пачатку творчага шляху і па сёння — найперш народны пісьменнік. Народны — значыць, любімы народам. І гэтае званне — самае важнае, самае пачэснае ў лёсе Шамякіна-творцы.

У чым сакрэт папулярнасці кніг Івана Пятровіча? Чаму не старэюць ягоныя раманы, аповесці, выдадзеныя даўным-даўно, і чым прывабліваюць тыя, што напісаны за апошнія гады? Дарэчы, мала хто з беларускіх пісьменнікаў можа паспаборнічаць з Шамякіным у працаздольнасці. Уражвае, што і сёння, у сталым веку, ён актыўна працуе. Увогуле ж, калі сабраць разам усе яго апавяданні, раманы, аповесці, нарысы, п'есы, эсэ, кінасцэнарыі, то выйшла б на дзесяць ладных тамоў. Дык вось, папулярнасць празаіка Шамякіна, і ў тым сыходзяцца шматлікія даследчыкі-літаратуразнаўцы, — у ягонай мастакоўскай сумленнасці перад праўдай жыцця. Гэта па-першае. А па-другое, пісьменнік заўжды трымаў і трымае руку, як кажуць, на пульсе часу. Пры гэтым ён далёкі ад творчай і палітычнай кан'юнктуры. І, па-трэцяе, што, бадай, самае галоўнае, — Бог шчодра надзяліў яго талентам, адметным і непаўторным. Гэты талент ва ўменні выбудаваць сюжэт, інтрыгу, перадаць словамі ўсё багацце душэўных пакут, радасцей і памкненняў сваіх герояў. Вылучае Шамякіна і тое, што ўся яго творчасць прасякнута нейкай асаблівай прасветленасцю, якою поўняцца кніжкі. Вы ўслухайцеся толькі ў іх назвы: "У добры час", "Трывожнае шчасце", "Глыбокая плынь", "Сэрца на далоні", "Вазьму твой боль". І сёння шамякінскія героі, выпісаныя ў гэтых творах, жывыя і праўдзівыя. Яны сучасныя і актуальныя ў сваіх дзеяннях, нягледзячы на тое, што на двары ўжо зусім іншая эпоха.

Сакрэт папулярнасці Шамякіна і ў тым, што ён востра адчувае праблемы нашага жыцця. Ён не наводдаль ад іх, а ў самым эпіцэнтры, у гушчыні падзей. Таму мы і называем яго сучасным летапісцам эпохі. Шамякін не проста адлюстроўвае час, але надае яму філасофска-мастацкае гучанне. Увогуле праблемнасць — нязменная і вызначальная якасць Шамякіна. Гэта пачалося з "Крыніц" — першай кнігі, дзе на поўны голас выкрываецца псіхалогія прыстасавальніцтва. Яшчэ глыбей і шырэй падаецца тая ж праблематыка ў вострaканфліктных раманах "Глыбокая плынь" і "Сэрца на далоні". У вобразах, у характарах герояў гэтых твораў увасобіліся тыповыя рысы цэлага пакалення людзей, на чыю долю выпалі і суровыя выпрабаванні ваеннага часу, і пасляваеннага.

Іван Пятровіч Шамякін — любімец моладзі, асабліва школьнай. Ягоная кніга "Трывожнае шчасце" — бадай самая любімая юнацтвам нашай краіны. Нездарма ж з году ў год яна б'е рэкорды па тыражах і колькасці перавыданняў.

У апошняе дзесяцігоддзе мы адкрылі для сябе і Шамякіна-гісторыка. Раман Івана Пятровіча "Петраград—Брэст" цікавы тым, што ў ім раскрыты невядомыя раней старонкі айчыннай гісторыі. Да таго ж мы зноўку пераканаліся, што сапраўдны майстар, якім і з'яўляецца Іван Пятровіч Шамякін, і пра сумныя палітычныя перыпетыі можа напісаць ярка, свежа і займальна.

Сёння патрыярху беларускай мастацкай прозы, цудоўнаму і шчодраму душой чалавеку Івану Пятровічу Шамякіну спаўняецца 80 гадоў. Як добра, што сваёй сумленнасцю, мастацкай прынцыповасцю ён падказвае ўсім нам, як трэба жыць, каб не страціць з гадамі жыццялюбства і веру ў дабро.

З юбілеем вас, шаноўны Іван Пятровіч! І хай ваша пяро не ведае стомы яшчэ доўга-доўга!

Георгій ЧЫГІР.

ТВОРЧАСЦЬ

Валянцін ДУДКЕВІЧ,
народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага ансамбля танца:

"А ПОШЛАСЦІ ПАСТАВІМ ЗАСЛОНУ..."

"Песня пра зубра" — так будзе называцца паўтарагадзінны спектакль, які задумаў і ўжо рэпетыруе са сваім калектывам мастацкі кіраўнік ансамбля танца Валянцін Дудкевіч. У сапраўднасці гэта будзе не зусім танец і не зусім сюіта, а нешта большае, бо ў незвычайнай харэаграфічнай дзеі возьмуць удзел не толькі артысты балета, але і знакаміты хор "Санорус" і драматычныя акцёры з Купалаўскага тэатра. Валянцін Уладзіміравіч, як і ўсякая творчая асоба, цяпер, што называецца, з галавой у новым праекце. Таму, хто хоць крышку знаёмы з працай харэографа-пастаноўшчыка, не варта тлумачыць, колькі сіл, якога творчага напружання вымагае кожная новая работа, тым больш такая.
Мы сустрэліся пасля чарговай рэпетыцыі, але не толькі каб пагаварыць пра новую пастаноўку. Хоць, як высветлілася, тыя праблемы, якія хвалююць сёння і грамадства ў цэлым, і творчую інтэлігенцыю ў прыватнасці, "замкнёны" якраз на ідэі будучага спектакля. Але пра ўсё па парадку.

— Валянцін Уладзіміравіч, чаму ўсё ж вы звярнуліся да знакамітай паэмы Міколы Гусоўскага, якая была напісана 500 (без малога) гадоў таму?

— Гэта не зусім так. У сапраўднасці спектакль толькі называецца "Песня пра зубра". Ці, скажам так, паводле "Песні пра зубра". Вы ж памятаеце сярэднявечны твор нашага славутага паэта-гуманіста ў перакладзе з лацінскай мовы гучыць дакладна так: "Песня пра постаць, дзікасць зубра і паляванне на яго". Іншымі словамі, змест паэмы заснаваны на асабістых назіраннях, уражаннях і перажываннях паэта, вылучаецца цеснай сувяззю з тагачаснай беларускай рэчаіснасцю. Гусоўскі з вялікай мастацкай сілай апісаў прыроду роднага краю (называў яго Літвою) і паляванне на зубра, праўдзіва падаў і ўзнавіў ратныя і працоўныя справы свайго народа. Адным словам, вобраз зубра — сімвал нашай Бацькаўшчыны. У паэме выявіўся рэнесансавы эстэтычны ідэал самога паэта з ягонай верай у гарманічна развітага, духоўна і фізічна дасканалага чалавека. На двары ж быў пярэдадзень Рэнесанса, Адраджэння, час вялікага князя Вітаўта.

Мне захацелася нас сённяшніх вярнуць да рэнесанса нашай духоўнасці. Разумееце, гісторыя зубра пасягае з часоў каменнага веку. Чаго толькі ні вытрываў волат зямлі нашай за гэтыя вякі! Хто толькі ні паляваў на яго! Але ж выжыў, захаваў сябе, свае звычаі, норавы, сваю, як кажуць, самасць. Гэтак і чалавек наш — беларус. Захаваў і сябе, і сваю душу, і сваю адметнасць. Але цяпер мы жывём не ў самы спрыяльны час: парушаны ідэалы, размыты маральныя крытэрыі, пошласць гуляе па экранах. І ўсё ж я, тым не менш, веру ў наш рэнесанс. Але за яго трэба біцца. Пра гэта і спектакль, які мы ствараем.

— На адным з апошніх канцэртаў ваш калектыў паказаў дзівосныя кампазіцыі — "Ave Maria" і "Паланез". Я чуў, што гэта ўсяго толькі фрагменты з будучага спектакля.

— Вы напраўду маеце рацыю. "Ave Maria" і "Паланез" хоць і асобныя канцэртныя нумары, але арганічна ўвойдуць у "Песню пра зубра". Публіка, дарэчы, прыняла абедзве кампазіцыі вельмі прыхільна. І гэтая акалічнасць падказвае мне, што мы ідзём у правільным кірунку.

— Цяпер ва ўсю дыскутуюць пра шляхі далейшага развіцця нашай культуры і мастацтва. Якраз пра гэта пойдзе гаворка і на той нарадзе, якая неўзабаве адбудзецца ў Палацы рэспублікі і ў якой возьмуць удзел Прэзідэнт краіны і наша творчая інтэлігенцыя. Што вас, як кіраўніка вядучага ў краіне харэаграфічнага калектыву, хвалюе сёння болей за ўсё?

— Многае. Але найперш — засілле на сцэне, на тэле- і кінаэкране таго, што мы называем халтурай, прымітывізмам, пошласцю. Заездждая нізкапробная папса навязла, як кажуць, у зубах. Я не магу зразумець, хто ў нас адказвае за ўсё гэта? Чаму не пазбаўляюцца ліцэнзій тыя, хто пастаўляе ў Беларусь гэтых залётных аднадзёнак-крыўляк?

Ну добра, няма цэнзуры. Хай сабе. Але ж павінны быць нейкія мастацкія саветы, кантралюючыя органы з боку прафесіяналаў у мастацтве. Інакш маісеевы, пенкіны, хлебнікавы і розная іншая распуціншчына акоцяць усіх нас такім брудам, што не адмыемся век. Па сутнасці, ідзе самая сапраўдная інтэрвенцыя на людскія душы. Ужо пакалечана пакаленне 15—17-гадовых.

— Што можна супрацьпаставіць той навале, што завецца бездухоўнасцю, Валянцін Уладзіміравіч?

— Разумею, што Інтэрнету і спадарожнікавай сувязі цяжка нешта супрацьпаставіць. Ды і не варта, бо ад іх усё ж больш карысці, чым зла. Але што тычыцца канцэртнай, гастрольнай дзейнасці, то тут парадак, хаця б элементарны, навесці проста неабходна. Па вялікаму ж рахунку гэтай бездухоўнасці можна супрацьпаставіць толькі адно — высокае мастацтва. Дзеля гэтага і быў задуманы спектакль "Песня пра зубра".

— Многія дзеячы мастацтва і ўвогуле культуры пакутуюць сёння ад безграшоўя, калектывы — ад мізэрнага фінансавання. Як у вас на гэтым фронце?

— Ды як у большасці. Але трэба разумець, якая ў нас эканоміка — такое і фінансаванне. Іншая справа, што ў нас (у культуры маю на ўвазе) не заўсёды ашчадна, з розумам трацяцца тыя бюджэтныя сродкі, якія ёсць. Ну вось маленькі прыклад. Дзяржава падтрымлівае фінансава, скажам, сімфанічны аркестр ці там драматычны тэатр альбо наш ансамбль танца. Увогуле такіх калектываў не шмат у краіне, але яны — яе сапраўдны твар, бо гэта высокае мастацтва, сапраўдны прафесіяналізм, гонар нацыі, можна сказаць. Дарэчы, такая ж практыка і ва ўсіх астатніх краінах. Але, даруйце, там дзяржава ніколі не фінансавала і не фінансуе эстрадныя калектывы. Яны самі зарабляюць на сябе, бо гэта дазваляе, так бы мовіць, жанр, характар дзейнасці эстраднікаў. А ў нас? У нас нават "Песняры" на датацыі. Між іншым, у недалёкім мінулым тыя ж "Песняры", "Сябры" ўскосна фінансавалі многія філарманічныя калектывы. А цяпер амаль уся наша эстрада сядзіць на шыі падаткаплацельшчыка. Такую заганную палітыку трэба нейкім чынам мяняць.

— Цяпер лепшыя артысты, лепшыя выканаўцы ад'язджаюць за мяжу. У пошуках таго ж хлеба надзённага. Ваш калектыў не закранула гэтая праблема?

— А як вы думаеце, калі там, на Захадзе, артыст балета, нават працуючы ў задрыпаным кабаку, зарабляе за вечар столькі, колькі тут за цэлы месяц? Канешне, праблема існуе. За мінулыя тры гады адток артыстаў толькі з нашага ансамбля танца склаў недзе каля 30 працэнтаў. А вось тое, што ад'язджаюць лепшыя з лепшых, — не зусім праўда. Крыўдна іншае: тое, што імпрэсарыо і розныя іншыя дзялкі перахопліваюць зусім маладых, неапераных ні ў мастацтве, ні проста ў жыцці юнакоў і дзяўчат, часам нават тых, хто толькі ўчора скончыў харэаграфічны каледж. Стаць жа прафесіяналам, сапраўдным артыстам можна толькі папрацаваўшы 3—4 гады ў класным калектыве, з вопытнымі педагогамі, а не ў кабаку. Але, калі па шчырасці, людзей, нават гэты маладняк, зразумець можна: ім хочацца нармальна жыць, прыгожа апранацца, мець уласны дах над галавой. Вось і едуць.

— І напаследак, Валянцін Уладзіміравіч, за сорак гадоў сваёй творчай дзейнасці вы аб'ездзілі з гастролямі не толькі ўсю Беларусь, але і ўсю планету. Дзе і якая публіка лепш за ўсё прымала мастацтва Беларускага дзяржаўнага ансамбля танца?

— Не паверыце, але ні разу і нідзе — ці то ў нас на радзіме, ці то ў Амерыцы альбо ў Еўропе — мы не падвялі ні сябе, ні нашу Беларусь. Заўсёды нас суправаджаў поспех. А прымаюць паўсюль аднолькава, калі ты на вышыні, калі тваё мастацтва — жывое, паўнакроўнае, калі яно нясе людзям радасць і, галоўнае, духоўную ўзнёсласць.

А тое, што хутка споўніцца сорак гадоў маёй творчай кар'еры, — гэта сапраўды так, у кастрычніку будзем адзначаць.

— Дзякуй за інтэрв'ю. І — спадзяюся патрапіць на прэм'еру спектакля "Песня пра зубра"...

Гутарыў Георгій ЧЫГІР.

Футбол

Заключительный аккорд "Славии"

Виктор БЕЛОУСОВ

Что бы ни говорили о футбольном турнире "Итера — Кубок Содружества", который в воскресенье завершился в Москве, а он все-таки нужен. После окончания чемпионата страны прошло достаточно много времени, и болельщик соскучился по любимой игре. Каждый новый сезон несет в себе и новые надежды. Сердцу не прикажешь, начинает стучать учащенно. А душа тревожно ждет: вдруг любимая команда чудесным образом преобразится и начнет всех громить, вплоть до грандов европейского футбола.

Чудесного преображения ждали мы и от "Славии". Она первой из белорусских клубов вступила в официальный сезон. По большому счету мозыряне не разочаровали. Но и не удивили приятно. На поверку оказалось, что белорусы далеки сегодня даже если учитывать столь раннее по нашим меркам начало сезона, от уровня участника Лиги чемпионов, коим является московский "Спартак".

Напряженным моментом стало прежде всего то, что мы пока несостоятельны и в сравнении с куда менее мастеровитыми рижанами. "Сконто" легко одолел "Славию", что зародило сомнения в правильности пути, избранного главным тренером мозырян югославом Владо Петровичем. Тем паче что совсем невыразительно "Славия" выглядела с совсем уж никому не известным "Варзобом" из Душанбе.

Обрадовал же факт выхода во второй этап, в четверку лучших команд СНГ. Неплохо и то, что победа над "Каунасом" пришла в экстремальных условиях — при игре в меньшинстве и при минус два гола после первого тайма.

Скорее всего, ранним началом сезона объясняется и чередование хороших игр с провальными.

В связи с этим, честно говоря, не очень верилось, что в заключительном матче "Славия" будет биться не щадя живота своего. Приятно было ошибиться. Ведь "Копетдагу" победа нужна была как воздух — выходили в финал. При определенном стечении обстоятельств, разумеется.

Петровичу в тот день удалось вывести на поле, пожалуй, сильнейший на сегодня состав. Стало понятно, что значит для защиты югослав Дробняк. Еще раз пришлось убедиться, какой грозный у нас тандем нападающих Василюк—Стрипейкис. Да и организаторские способности, опять же, югослава Грубера проявляются все четче.

Как бы там ни было, но "Славия" в последней игре показала свою лучшую игру на турнире. У "Копетдага" до отчетной встречи просто здорово играла защита, пропустившая меньше всех голов.

А здесь оборонительные порядки ашгабадцев под напором атак мозырян рухнули уже в начале игры. На 13-й минуте Стрипейкис эффективно ударом головой завершил комбинацию товарищей по команде. А до этого могли забить тот же Стрипейкис, Василюк и Дробняк.

Немудрено, что туркменцы растерялись. И их счастье, что до перерыва пропустили только два гола — отличился еще и Василюк.

Во втором тайме избиение продолжалось. Ашгабадцы провели только одну комбинацию, которая завершилась ударом в штангу.

А белорусы еще дважды добивались успеха — забивали Стрипейкис и Саматов.

4:0 — эффектный хлопок дверью.

Этой победой наши земляки лишили интриги матч "Спартак" — "Сконто". Москвичи уже были в финале, а путевку туда они своей победой вручила "Славия". Вот почему рижане особо не усердствовали, играли в свое удовольствие. Зрители увидели неконтактный футбол с обилием голов. 4:1 — победа за "Спартаком".

Зато в финале мы наблюдали совсем другой "Сконто" — жесткий, отмобилизованный. Построив тягучие защитные бастионы, рижане мгновенно переходили в контратаки. По итогам первого тайма соотношение ударов по воротам было 19:5 в пользу "Спартака", а счет 1:0 в пользу "Сконто". Лайзанс убежал от защитников и заставил капитулировать Филимонова.

Москвичам стоило большого труда сравнять счет и перевести игру в овертайм. И только на 8-й минуте первой добавочной десятиминутки Цихмейструк забил "золотой" гол.

Ох, не просто так "Славия" проиграла "Спартаку" и "Сконто". Солидные они все же команды. У них есть чему поучиться. А быть третьими в такой компании ничуть не зазорно...

Анекдот

Двое папаш катят в парке колясочки с малышами. Один говорит:

— Знаешь, обожаю я своему Кольке колыбельные петь... Часов до трех ночи могу. Бывает, что и с друзьями поем!..

Фристайл

Покоряет вершину за вершиной

После успешного выступления на чемпионате мира по фристайлу в акробатических прыжках продолжают радовать своих почитателей белорусские мастера.

На очередном этапе Кубка мира еще раз доказал всем, что является на сегодня лидером в своей дисциплине, Дмитрий Дашинский. Сложность программы и чистота исполнения упражнений покорили не только зрителей, но и судей. Белорус стал первым.

Такой боевой дух сохранить бы до Олимпиады в Солт-Лейк-Сити.

Иван СЕРГЕЕВ.

Надвор'е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, пераважна без ападкаў, на дарогах месцамі галалёдзіца. Вецер няўстойлівы, слабы. Тэмпература паветра ў Гомелі — 0—2 градусы цяпла, Брэсце — каля нуля, Мінску, Гродне — 0—2, Магілёве — 1—3, Віцебску — 2—4 градусы марозу.

У наступныя двое сутак чакаецца воблачнае надвор'е, 31 студзеня ў паўночнай палавіне, 1 лютага на значнай частцы тэрыторыі снег, месцамі моцны, мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — 1—7, на поўначы — да 10, удзень — 0—5 градусаў марозу.

Астранамічны каляндар — 30.01

Узыход і заход сонца: Мінск — 8.00, 16.45; Віцебск — 7.55, 16.30; Магілёў — 7.49, 16.35; Гомель — 7.41, 16.37; Гродна — 8.14, 17.02; Брэст — 8.09, 17.08.

Даўжыня дня ў Мінску 8 гадзін 45 мінут. 1 лютага першая квадра.

Калектыў "Народнай газеты" выказвае глыбокае спачуванне ўласнаму карэспандэнту Міхаілу Адамавічу КРЫЖАНОЎСКАМУ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю брата Уладзіміра.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА
Даведкі па тэл.: 268-28-70; 268-25-59.
Рэкламнае бюро — тэл. — (017) 268-28-11, тэл./факс — 268-25-29, (017) 268-25-28 — факс.
Тэлефоны карэспандэнцкіх пунктаў: у Брэсце — 5-32-92; у Віцебску — 96-11-23; у Гомелі — 53-88-74; у Гродне — 47-22-16; у Магілёве —32-72-87, у Пінску — 34-23-09; у Салігорску — 2-49-60; у г.п. Радашковічы — 95-4-87.
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
E-mail: info@ng.press.net.by
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.
Індэкс 63868.
Выдавец — адкрытае акцыянернае таварыства "Народная газета".
Адрас: Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
Выходзіць штодзённа, акрамя нядзелі і панядзелка, 250 разоў у год.
Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах.
Падпісана ў друк у 19.10. Заказ № 544.
Газета аддрукавана ў друкарні выдавецтва "Беларускі Дом друку".
Адрас: Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.
Спосаб друку — афсетны, фармат А-2
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Галоўны рэдактар Міхаіл ШЫМАНСКІ